Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 САКАВІКА 2015 г. АЎТОРАК № 55 (27913) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Шчырая размова пра залежнасць

СТАР. 3

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



Залаты бізнес



На сцэне зорка, а дома…

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК:**

*«Па звестках Міжнароднага антыкарупцыйнага агенцтва, нідзе ў свеце не ўдалося перамагчы карупцыю. Ні ў Новай Зеландыі ці Даніі, якія дзеляць першае месца ў антыкарупцыйным рэйтынгу, ні ў Кітаі, дзе за хабар прадугледжаны расстрэл. Галоўнае, на думку экспертаў, наколькі дзяржава здольная супрацьстаяць гэтай з'яве. У Беларусі ўлада не замоўчвае праблемы, мае палітычную волю і здольнасць з імі змагацца. Калі ў поўнай меры супрацьстаяць карупцыі не атрымліваецца, то знізіць яе парог цалкам магчыма. У апошнія гады ў Беларусі колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў не перавышае 2-3% ад агульнага ліку зарэгістраваных».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14680,00 | ▼ |
| Еўра | 15860,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 247,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 638,96 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ГЛОБУС — НАШ!

## Дар'я Домрачава ўпершыню ў кар'еры заваявала Вялікі хрустальны глобус

**Апошні этап Кубка свету прынёс Дар'і перамогу ў агульным заліку па выніках сезона. У дзвюх з трох асабістых гонак у Ханты-Мансійску трохразовая алімпійская чэмпіёнка фінішавала перад сваёй галоўнай саперніцай Кайсай Мякярайнен (у гонцы праследавання Домрачава заваявала дзявятае «золата» ў сезоне. — Аўт.). Гэтай розніцы ў балах хапіла, каб утрымаць першы радок у генеральнай класіфікацыі.**

«Нарэшце можна выдыхнуць! Вельмі сур'ёзная барацьба была да апошняй гонкі, — адзначыла Дар'я Домрачава пасля масстарту. — Дзіўны і вельмі складаны сезон атрымаўся. Цяпер проста хочацца адпачыць. Дзякуй усім, хто мяне падтрымліваў і верыў у мой поспех.

Дагэтуль беларуская біятланістка двойчы ва ўпартай барацьбе саступала званне лепшай біятланісткі сезона: у сезоне 2011/2012 — Магдалене Нойнер, у наступным — Торы Бергер. Нягледзячы на неверагодна паспяховае выступленне на Алімпіядзе ў Сочы, вынікі якой не ўлічваліся ў заліку Кубка свету, мінулы сезон Дар'я скончыла на трэцім месцы.

Адзначым, што другі раз у гісторыі біятлона беларуская біятланістка заваявала Вялікі хрустальны глобус. У сезоне 1993/1994 ён дастаўся Святлане Парамыгінай. З тых пор і да сёлетняга сезона гэты трафей выйгравалі выключна спартсменкі са Скандынавіі і Заходняй Еўропы.

Цяпер скарбонка беларускай біятланісткі абсалютна поўная. Домрачава мае ўзнагароды на ўсіх узроўнях: пачынаючы ад універсіяд і заканчваючы Алімпійскімі Гульнямі — усё, каб лічыцца жывой легендай сусветнага біятлона. А па колькасці перамог на этапах Кубка свету Дар'я саступае толькі Магдалене Форсберг і Ушы Дзізль. Мабыць, гэта і ёсць наступны арыенцір для нашай Дашы?

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

**З перамогай у агульным заліку Кубка свету па біятлоне Дар'ю Домрачаву павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Дарагая Дар'я! Віншую! Малайчына, ты зноў падарыла нам свята, пацвердзіўшы званне найвялікшай біятланісткі свету. Уся Беларусь з заміраннем сэрца сачыла за тваімі выступленнямі. І ты не падвяла. Ва ўпартым дасягненні гэтай мэты ты паказала самае высокае майстэрства і сапраўдны байцоўскі характар», — гаворыцца ў віншаванні. «Дзякуй за незабыўныя хвіліны шчасця і гордасці! Чакаем цябе на Радзіме», — дадаў кіраўнік дзяржавы.**



Фота БЕЛТА.

■ Кампенсацыя

## «ФІЗІКІ» АТРЫМАЮЦЬ НАПОЎНІЦУ

### А індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы павінны разбірацца з часовай адміністрацыяй Дэльта Банка

**Згодна з заканадаўствам, атрымаць кампенсацыю па ўкладах (дэпазітах), размешчаных у банках Рэспублікі Беларусь, маюць права фізічныя асобы — грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства. Да аб'ектаў кампенсацыі банкаўскіх укладаў фізічных асоб адносяцца бягучыя (разліковыя) рахункі фізічных асоб, карт-рахункі фізічных асоб, дабрачынныя рахункі фізічных асоб, уклады да запатрабавання фізічных асоб, тэрміновыя ўклады фізічных асоб, умоўныя ўклады фізічных асоб, ашчадныя сертыфікаты, выпушчаныя банкам. А вось банкаўскія ўклады фізічных асоб, якія выступаюць у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, не з'яўляюцца аб'ектамі кампенсацыі. У такім выпадку варта звяртацца ў часовую адміністрацыю банка.**

СТАР. 5

■ Надвор'е

## Цяпло вяртаецца канчаткова?

### У чацвер сонейка прыпячэ да плюс 16

**На гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі зноў пачне паступаць цёплая паветраная маса з боку Заходняй Еўропы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У сераду чакаецца цёплае і камфортнае надвор'е, калі непрацяглыя дажджы магчымыя толькі месцамі ў паўночных рэгіёнах краіны. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы на сераду ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — ад плюс 7 градусаў па поўначы да 16 цяпла па поўдні краіны. У чацвер атмасферныя франты з поўдня Еўропы прынясуць кароткачасовыя ападкі ўжо на ўсю тэрыторыю Беларусі. Тэмпература паветра ўначы будзе складаць ад мінус 1 да плюс 6 градусаў, удзень — 6-13 цяпла, а па поўдні да плюс 16 градусаў. Істотна не зменіцца надвор'е і напрыканцы тыдня.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, з пятніцы і да нядзелі ўключна на большай частцы краіны чакаюцца непрацяглыя ападкі (пераважна дождж). Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да 7 цяпла, удзень — плюс 7-13 градусаў, па паўднёвым захадзе месцамі да 15 цяпла. Толькі ў асобных раёнах паўночнага ўсходу будзе халаднавата — не больш за плюс 4-6 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# ДЫРЭКТЫВА №2 У НОВАЙ РЭДАКЦЫІ

**Дырэктыва Прэзідэнта ад 27 снежня 2006 г. №2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату» прынята ў новай рэдакцыі. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У мэтах павышэння якасці жыцця людзей працэсу дэбюракратызацыі прапануецца надаць ўсеагульны характар, распаўсюдзіўшы яго не толькі на дзяржаўны апарат, але і на ўсе структуры, якія ўзаемадзейнічаюць з грамадзянамі.

Ключавой асаблівасцю новай рэдакцыі Дырэктывы №2 таксама з'яўляецца выразная ўстаноўка на вырашэнне ўсіх праблем і цяжкасцяў насельніцтва ў першую чаргу непасрэдна на месцах. У гэтай сувязі стварэнне неабходных умоў для забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці грамадзян, павышэнне якасці аказання паслуг насельніцтву аднесена да найважнейшых задач мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Так, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даручаецца арганізаваць у кожным раёне, у тым ліку на платнай аснове, прадастаўленне насельніцтву розных запатрабаваных на практыцы паслуг (напрыклад, па арэндзе тэхнікі для правядзення сельскагаспадарчых і будаўнічых работ), а таксама ў прыярытэтным парадку забяспечыць належную работу арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі і іншых арганізацый, якія аказваюць паслугі насельніцтву. Прадугледжваецца ўкараненне сістэмы рэйтынгавай ацэнкі грамадзянамі эфектыўнасці дзейнасці такіх арганізацый.

Для павышэння адкрытасці дзяржаўных органаў на кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (іх намеснікаў) ускладаецца абавязак праводзіць кожную сераду з 8.00 да 13.00 асабісты прыём грамадзян, кожную суботу з 9.00 да 12.00 прамыя тэлефонныя лініі, не радзей як адзін раз на квартал выязныя асабістыя прыёмы.

Акрамя таго, замацоўваецца шэраг захадаў, накіраваных на павышэнне ўзроўню інфарматызацыі ў сферы працы з грамадзянамі і арганізацыямі, у тым ліку на арганізацыю магчымасці здзяйснення адміністрацыйных працэдур у электронным выглядзе.

# ■ Парламенцкі дзённік

# АКТЫВІЗАВАЦЬ УЗАЕМНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Менавіта дзеля гэтага ўпершыню ў Беларусь завітала парламенцкая дэлегацыя Султаната Аман. Візіт распачаўся сустрэчай са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаілам Мясніковічам.**

«У адносінах Беларусі і вашай краіны — Султаната Аман — адсутнічаюць нейкія праблемныя пытанні, і ўсе нашы двухбаковыя адносіны носяць даверны характар», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. Ён таксама расказаў, што погляды нашых краін на актуальныя міжнародныя пытанні шмат у чым блізкія альбо супадаюць. «Таму мы зацікаўлены ў развіцці ўсебаковых сувязяў, як гандлёва-эканамічных, так і парламенцкіх і гуманітарных», — дадаў спікер верхняй палаты беларускага парламента.

Нягледзячы на парламенцкі ўзровень сустрэчы, Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што «фундаментам умацавання усяго спектра адносін» з'яўляецца перш за ўсё эканамічны складнік.

Акрамя таго, спікер верхняй палаты парламента паведаміў, што паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Дзяржаўным Саветам Султаната Аман ужо падпісаны дакумент аб супрацоўніцтве. Таму сенатар выказаў жаданне пабачыць старшыню Дзяржаўнага Савета ў межах афіцыйнага візіту ў нашай краіне.

Асноўныя напрамкі, па якіх Беларусь і Аман плануюць наладжваць супрацоўніцтва, — адукацыя, культура і, вядома ж, эканоміка. «Галоўная мэта гэтага візіту — актывізаваць ужо існуючае супрацоўніцтва па гэтых напрамках», — патлумачыў кіраўнік групы дружбы Султаната Аман Ахмад бэн Алі бэн Мухамад аль-Машыхі.

У бліжэйшыя дні дэлегацыя наведае асноўныя эканамічныя, культурныя і медыцынскія пляцоўкі нашай краіны: «Беларуськалій», «БелАЗ», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, установы ахові здароўя. Візіт працягнецца да 26 сакавіка.

**Вераніка ПУСТАВІТ** ■

# НОВЫЯ АГУЛЬНЫЯ ПАДЫХОДЫ

## ПАВІННЫ ШУКАЦЬ У РЭГІЯНАЛЬНЫМ УЗАЕМАДЗЕЯННІ БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Арэнбургскай вобласці Расійскай Федэрацыі Юрыем Бергам, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што гэты візіт дэлегацыі Арэнбургскай вобласці дасць новы адзін імпульс развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што ў 2013 годзе ў гандлі быў дасягнуты добры вынік: тавараазварот Беларусі з гэтым расійскім рэгіёнам перавысіў $1 млрд. Аднак у 2014 годзе ён скараціўся ў два разы. На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, такая сітуацыя патрабуе прыняцця аператыўных захадаў па аднаўленні дадатнай дынамікі двухбаковых адносін.

«Лічу, што ў цяперашніх няпростых умовах актыўны пошук новых агульных падыходаў у рамках рэгіянальнага ўзаемадзеяння з'яўляецца важным складнікам беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў цэлым», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У Арэнбургскай вобласці створаны дзве зборачныя вытворчасці беларускай тэхнікі — жнеяран вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш» і трактароў МТЗ. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што бакам не трэба абмяжоўвацца гэтымі праектамі, трэба прапрацоўваць новыя варыянты супрацоўніцтва, больш актыўна выкарыстоўваць вытворчы, навукова-тэхналагічны і кадравы патэнцыял.

Паводле слоў Прэзідэнта, вельмі важным у рэгіянальным узаемадзеянні з'яўляецца супрацоўніцтва ў сельскагаспадарчай сферы. І ў Беларусі, і ў Арэнбургскай вобласці гэта галіна інтэнсіўна развіваецца. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што перспектыўным з'яўляецца ўзаемадзеянне ў будаўніцтве і навукова-тэхнічнай сферы.

# МНОГІЯ ЛЕТА!

**Ганаровы Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Філарэт атрымаў ордэн Рускай Праваслаўнай Царквы 1-й ступені свяціцеля Алексія, мітрапаліта Маскоўскага. На ўрачыстым вечары ў гонар 80-годдзя архіерэя і адбылося ўручэнне ўзнагароды ад імя Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, якую юбіляр атрымаў ад Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла.**


Фота БЕЛТА.

Ганаровая адзнака стала чарговай у цэлым шэрагу ўзнагарод мітрапаліта Філарэта, сярод якіх медаль і ордэн Францыска Скарыны, ордэны Айчыны III ступені, Пашаны, Дружбы народаў, расійскі ордэн «За заслугі перад Айчынай» IV ступені і іншыя.

«Аднаўленне лепшых традыцый праваслаўя ў Беларусі ў перыяд архіпастырскага служэння мітрапаліта Філарэта з'явілася важным укладам у духоўную скарбніцу нашай Айчыны. Захаванне міру і згоды ў шматканфесійнай Беларусі, забеспячэнне сапраўднага паразумення паміж прадстаўнікамі розных веравызнанняў шмат у чым дасягнуты дзякуючы прынцыповай пазіцыі Беларускай Праваслаўнай Царквы пад кіраўніцтвам мітрапаліта Філарэта, — адзначыў **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** падчас урачыстасці. — Павагай, удзячнасцю і любоўю да вас перапоўнены вернікі за сапраўдны гуманізм, умацаванне лепшых традыцый хрысціянства на нашай зямлі».

«Асаблівай удзячнасці заслугоўваюць стваральныя працы ганаровага экзарха, накіраваныя на ўсебаковае развіццё дыяцэзій і парафій БПЦ, — гаворыцца ў віншаванні Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. — Мітрапаліт Філарэт заўсёды надаваў належную ўвагу духоўна-маральнаму выхаванню падрастаючага пакалення, канструктыўна ўзаемадзейнічаў са свецкай уладай, дзеячамі навукі, адукацыі і культуры».

**Паводле інфармацыі БЕЛТА.**

# ■ Блізкая ўлада

# Разбяруцца і дапамогуць

**У суботу ўпершыню на «прамой лініі» быў Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама. Ён быў прызначаны на гэтую пасаду напрыканцы мінулага года. І падчас выслухвання зваротаў Мікалай Мікалаевіч перыядычна падкрэсліваў, што ён «чалавек новы». Таму хоча пачуць сутнасць скаргі без лішніх слоў, як мага дакладней. Больш як за тры гадзіны выслухаў каля сарака чалавек. Што здзівіла, мала званкоў было з глыбінкі, пераважная большасць — з Віцебска.**


Фота Аляксея СПАТКАЯ.

## «ПРАФЕСІЙНАЯ СКАРЖНІЦА»

Сярод гараджан, якія патэлефанавалі, была жанчына, якую можна назваць «прафесійнай скаржніцай».

Карэспандэнт «Звязды» некалькі разоў яе чуў падчас аналагічных «ліній» з удзелам кіраўнікоў мясцовай улады, кантрольных органаў.

— У 2007 годзе капітальны рамонт нашага дома правялі... Туалет сумясцілі з кухняй, праект знішчылі. Да спальні прыбудавалі чужую веранду. Дакументацыю хай пакажуць! Куды не звяртаюся, адны адпіскі, — «рапартавала» жанчына.

Сітуацыю пракаментаваў мэр Віцебска. Аказалася, што ўсе службы не раз займаліся разглядам скаргі. І ніякіх парушэнняў не знайшлі. У доме зроблены капітальны рамонт. Дарэчы, яго можна назваць «элітным». Калісьці быў на дзве кватэры, потым адну прыбудавалі. Дык жыві і радуйся ў цішым цэнтры, але...

— У працэсе рамонту грамадзянка «ўносіла змены»: ванную зрабіць па-іншаму, кухню таксама. Усе заўвагі стараліся ўстаноўча тэхнічна вырашаць... Скардзілася на гэта і на тое. Імкнуліся пайсці насустрач і дараблялі, як маглі вырашалі пытанні. І быў падпісаны адпаведны акт здачы жылля ў эксплуатацыю... Яна прыватызавала кватэру некалькі гадоў таму. Сёння, згодна з заканадаўствам, за бюджэтны кошт мы не маем права нейкія рамонты рабіць. Могуць камунальнікі аказаць паслугі, але за плату, — растлумачыў **Віктар НІКАЛАЙКІН, старшыня Віцебскага гарвыканкама.**

З-за такіх «прафесіяналак», на думку Мікалая Шарстнёва, грамадзяне не могуць расказаць пра насамрэч важныя праблемы.

## ЖЫЛЬЦЫ ТАКСАМА ПАВІННЫ

Мікалай Мікалаевіч, калі пачуў пра яшчэ адзін праблемны дом, заклікаў жыльцоў падзельнічаць у навядзенні парадку.

— У Віцебску ў доме на тры пад'езды жывём. Чаму не ўцяпляюць? А побач дом параўнальна малады, дык там і вокны замянілі. А ў нас шум у кватэрах, бо дом на скрыжаванні насычаных транспартам вуліц... Нават пад'езды не рамантуюць, — эмацыянальна расказвала жанчына.

Губернатар наконт капітальнага рамонту сказаў, што былі б у бюджэце грошы, адрамантавалі б, не зацягваючы. Але ёсць і больш праблемныя дамы. І шмат людзей пастаянна скардзяцца на тое, што дзясяткі гадоў чакаюць капітальнага рамонту. На жаль, на ўсіх адразу не хапае бюджэтных сродкаў. Але ў пошуку грошай, упэўнены Мікалай Мікалаевіч, трэба шукаць і нярдынарныя падыходы.

— А ў пад'ездах павінны захоўваць парадак і самі жыльцы, — лічыць губернатар. — Бо хто там смеціць, хто сцены абліваe і лямпачкі б'е?

## ЗВАНКІ З ГЛЫБІНКІ

Вяскоўцы задалі пытанні, некаторыя з якіх можна назваць кансультацыйнымі. Напрыклад, чаму забаранілі свіней утрымліваць на прыватным падворку, які недалёка ад свінакомплексу? З-за наступстваў афрыканскай чумы, ад якой Віцебшчына пацярпела больш, чым іншыя вобласці краіны, адказаў губернатар і параіў перайсці на птушак.

Агучылі і вялікую адлегласць аўтобуснага прыпынку ад вёскі. Але ж адпаведны сацыяльны стандарт не парушаны. Губернатар паабяцаў асабіста выехаць на месца. Інвалід па зроку прасіў прывесці ў парадак невялікую дарожку, каб мог нармальна хадзіць. З будучай сталіцы абласных «Дажынак» — Талачына — пацікавіліся, чаму аўтобус заязджае да чыгуначнага вакзала толькі на паперы. Быў зварот наконт зямельнай спрэчкі. А жыхарка Суража выказала просьбу аб рамонце кватэры...

Мікалай Шарстнёў распарадзіўся на працягу тыдня разабрацца з кожным сігналам. І, калі ўлада можа ў канкрэтнай сітуацыі дапамагчы, трэба гэта зрабіць.

— А калі не, дык так трэба і сказаць людзям, каб не пісалі, не тэлефанавалі. Бо іх пытанне вырашыць немагчыма. І чалавек павінен гэта разумець... Грошай няма, навошта абяцаць пра рамонт і іншае? Абяцаем, і гэта змякчае сітуацыю, а чалавек чакае... Мы павінны праўдзіва з людзьмі размаўляць. І людзі нас зразумеюць, — канстатаваў пасля «прамой лініі» губернатар.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ** ■

# ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЭКЗАМЕНЫ Ў ЛІЦЭЙ — У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ПРОФІЛЮ

**У сувязі з увядзеннем з 1 верасня 2015/2016 навучальнага года на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі профільнага навучання, пералік уступных іспытаў для тых, хто плануе паступаць у ліцэі, будзе вызначацца самой установай адукацыі па ўзгадненні з аддзелам (упраўленнем) адукацыі, спорту і турызму.**

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве, пералік экзаменацыйных іспытаў залежыць ад пераліку профільных вучэбных прадметаў, што будуць вывучацца ў ліцэі на павышаным узроўні. Напрыклад, гэта могуць быць матэматыка і замежная мова або хімія і матэматыка.

Уступныя іспыты ў Ліцэй БДУ пройдуць 10,17, 23 і 24 мая. А ва ўсіх іншых ліцэях, што рэалізуюць праграму агульнай сярэдняй адукацыі, экзамены праводзяцца ў перыяд з 15 па 20 чэрвеня.

Рэкамендацыі аб асаблівасцях арганізацыі профільнага навучання будуць размешчаны на партале Міністэрства адукацыі і апублікаваны ў «Настаўніцкай газеце» да 1 мая 2015 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЧАС ПРЫБІРАЦЦА

**Месячнік па добраўпарадкаванні, азеляненні і прывядзенні ў парадак тэрыторый населеных пунктаў аб'яўлены на Брэстчыне з 16 сакавіка да 30 красавіка. Адпаведнае рашэнне прыняў Брэсцкі аблвыканкам.**

Паводле інфармацыі галоўнага санітарнага ўрача вобласці Нэлі ГІНДЗЮК, толькі з пачатку бягучага года спецыялістамі санітарных службаў накіравана больш за 1100 прадпісанняў і рэкамендацый аб выпраўленні парушэнняў у справе чысціні і парадку. Ужо ліквідавана 31 несанкцыянаваная звалка. Але падобныя ачагі з адходамі то там, то тут утвараюцца зноў. Таму іх трэба прыбраць да мая. А таксама падмесці, падграбці леташняе лісце, пасадзіць пабoлей кветак у гарадах і вёсках.

**Яна СВЕТАВА.**

■ Фестывалім!

# У МАГІЛЁЎ ЗАВІТАЎ «М@РТ.КАНТАКТ»

**Усё пачалося з відовішчнага спектакля на плошчы ў цэнтры горада. Артысты літоўскага тэатра «Пілес», пераапранутыя ў касцюмы часоў французскага караля Людовіка XV, амаль гадзіну ўтрымлівалі ўвагу гледачоў. Калі ўліччыць пасажыраў грамадскага транспарту, які запавольваў рух, калі праязджаў міма, захапляльныя сцэнкі з жыцця вядомай французскай фаварыткі мадам дэ Пампадур убачылі сотні гараджан. Наогул у першы дзень маладзёжнага міжнароднага форуму былі сыграны адразу 4 спектаклі. Такая насычаная праграма захаваецца на працягу ўсіх сямі дзён фестывалю.**

Трагедыі, камедыі, пластыка, сцэнічныя эксперыменты — гледача чакае сустрэча з героямі 19 пастановак у выкананні калектываў з 10 краін свету. На форум завіталі прадстаўнікі тэатраў Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Ізраіля, Германіі, Эстоніі, Арменіі, Кіргізіі. І большасць з іх — моладзь, якая паспела ўжо заявіць пра сябе і атрымаць першыя высокія ўзнагароды.

— Магілёўчанам можна пазайздросціць, што ў іх ёсць такое добрае вясновае свята, як «М@рт.кантакт», — адзначыла **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА.** — За час свайго існавання гэты форум пазнаёміў гледачоў з лепшымі пастаноўкамі айчынных і замежных аўтараў. А смелым і вынаходлівым творцам адкрыў шлях у вялікае мастацтва. Магілёў стаў трывалай творчай пляцоўкай для таленавітых маладых рэжысёраў, акцёраў, сцэнарыстаў.

Арганізатары фестывалю вырашылі, што сёлета, у Год моладзі, форум абыдзецца без прафесійнага журы. Гэта місія ўскладзена на саму моладзь. Менавіта маладым, якія ставяць свае адзнакі хутчэй сэрцам і эмоцыямі, будзе дадзена слова. Тым не менш на свята запрошаны міжнародныя тэатральныя эксперты, якія кожны дзень пасля прагляду будуць «перамываць костачкі» стваральнікам і ўдзельнікам пастановак.

Сярод тых, хто прыязджае ў Магілёў не ў першы раз, вядомы тэатр «Прытулак камедыянта» з Санкт-Пецярбургу. Той самы, дзе няма пастаяннай трупы, а лепшыя рэжысёры самі падбіраюць сабе акцёраў на свае пастаноўкі. Гэта творчая пляцоўка, дзе ажыццяўляюцца самыя дзёрзкія задумкі, якія не маюць магчымасці рэалізавацца на сцэне звычайнага штатнага тэатра. Спектакль «Каварства і любоў» у сучаснай версіі маладога таленавітага расійскага рэжысёра Васіля Бархатава, які адным з першых адкрыў тэатральную афішу «М@рт.кантакта», выклікаў неадназначныя эмоцыі ў гледачоў — ад захопленых з боку моладзі да вельмі крытычных з боку тэатразнаўцаў. Але ўсе сышліся думкамі ў тым, што таленавіты малады артыст Ілья Дэль у ролі Фердынанда і яго чароўная Луіза ў выкананні адоранай маладой актрысы Паліны Талстун (між іншым, зоркі тэлесерыялаў) былі непараўнальныя.

Уперадзе яшчэ шмат цікавых сустрэч і мерапрыемстваў. На форуме працуюць майстэрні маладой рэжысуры і маладой журналістыкі, падчас «круглага стала» ўдзельнікі абмяркуюць ролю сучаснай драматургіі ў сучасным тэатры. На працягу тыдня будзе выходзіць газета, дзе маладыя аматары тэатра падагульняюць свае назіранні за творчымі падзеямі аднаго фестывальнага дня. А гледачы маюць магчымасць пакінуць свае меркаванні наконт убачанага на спецыяльнай «сцяне», якая на час форуму ўсталявана ў фае драмтэатра.




Фота БЕЛТА.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Думай сам!

# ХОЧАШ ЖЫЦЬ — ПАЗБАЎСЯ ІЛЮЗІЙ ПРА СПАЙСЫ

**Шчырая размова прайшла днямі з удзелам студэнцкага актыву БДУІР. А ініцыятарам гутаркі стаў рэктар універсітэта Міхаіл БАТУРА, які запрасіў на сустрэчу старастаў груп і паверхаў універсітэцкіх інтэрнатаў, прадстаўнікоў студэнцкіх саветаў, куратараў груп і намеснікаў дэканаў факультэтаў. У актавай зале не засталося ніводнага свабоднага месца.**



— Як бы ні было складана ў гэтым прызнавацца, але наркатычная хваля закранула і наш універсітэт. За 2014 год два студэнты БДУІР трапілі ў поле зроку праваахоўных органаў. Курсант ваеннага факультэта быў асуджаны за распаўсюджванне наркотыкаў на 10,5 года. Яшчэ адзін наш студэнт атрымаў умоўны тэрмін, і мы далі яму другі шанц — пакінулі ва ўніверсітэце, — паведаміў прысутным Міхаіл Батура. — Я лічу, што два выпадкі — гэта больш чым сур'ёзная падстава для трывогі. Старасты груп — гэта людзі, якія павінны заўважаць усё, што адбываецца ў калектыве. Яны не могуць заставацца абыякавымі да гэтай праблемы і павінны рэагаваць на ўсе трывожныя сігналы. Таму я хачу раздзяліць адказнасць у гэтым пытанні менавіта з вамі. Безумоўна, можна было проста ўзяць з усіх студэнтаў подпісы, што тыя азнаёмлены з Дэкрэтам Прэзідэнта №6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму распаўсюджванню наркотыкаў». Але сур'ёзнасць пытання не дапускае фармальных падыходаў. І мы невыпадкова запрасілі на гутарку са студэнтамі спецыялістаў — каб вы маглі ўсю пачутую тут інфармацыю данесці да сваіх аднагрупнікаў і сяброў. Хацелася, каб мы сталі з вамі аднадумцамі ў гэтым пытанні...

— Пра рэальныя маштабы распаўсюджвання наркаманіі меркаваць даволі складана, — канстатаваў **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр КУПЧЭНЯ.** — Магу толькі сказаць, што калі я 15 гадоў таму пачынаў сваю службу ў міліцыі, сярод наркаманаў, што стаялі на ўліку, непаўналетніх не было. А сёння толькі ў сталіцы на ўліку знаходзяцца 150 непаўналетніх. Яшчэ некалькі гадоў таму аб праблеме спайсаў баяліся гаварыць уголас або не ведалі, што казаць. Але Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №6 паставіў рэальную заслону распаўсюджванню гэтай навалы. Сёння парог крымінальнай адказнасці за захоўванне наркотыкаў зніжаны з 16 да 14 гадоў. Дэкрэтам прадугледжаны шэсць відаў адміністрацыйнай адказнасці: за знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане наркатычнага ап'янення, за спажыванне наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў і іх аналагаў у грамадскім месцы, за знаходжанне на працоўным месцы ў стане наркатычнага ап'янення, адказнасць кіраўнікоў клубаў і забаўляльных устаноў, дзе будуць выяўлены факты распаўсюджвання або спажывання наркотыкаў... А калі кагосьці на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання затрымаюць у грамадскім месцы за спажыванне наркотыкаў або ў стане наркатычнага ап'янення другі раз, наступае крымінальная адказнасць (прадугледжаны арышт тэрмінам да трох месяцаў або абмежаванне свабоды на тэрмін да двух гадоў).

**Загадчык 21-га рэабілітацыйнага наркалагічнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Уладзімір ІВАНОЎ** таксама лічыць, што дэкрэт прынёс заўважны эфект:

— Упершыню са спайсамі мы сутыкнуліся недзе чатыры гады таму. А з 2012 года пацыенты пайшлі да нас вялікім патокам. Летась у маім аддзяленні пастаянна знаходзіліся 10—12 пацыентаў з залежнасцю ад спайсаў, але пасля снежня 2014 года (г.зн. пасля прыняцця дэкрэта. — **Аўт.**) карціна рака перадтварылася ў рука... рака пераўтварылася ў ручай. Мяркую, што гэта вынік працы нашай міліцыі. Цяпер у аддзяленні ў розны час знаходзіцца ад аднаго да чатырох пацыентаў з залежнасцю ад спайсаў. Частка іх страчвае розум, і яны пераводзяцца ў іншыя аддзяленні...

**«У адрозненне ад алкаголю і нават ад гераіну спажыванне спайсаў вельмі хутка развівае прыдуркаватасць».**

Асобна спецыяліст спыніўся на медыцынскіх аспектах.

— Усе маладыя людзі павінны ведаць і перадаць гэтую інфармацыю іншым: у адрозненне ад алкаголю і нават ад гераіну спажыванне спайсаў вельмі хутка развівае прыдуркаватасць. У псіхіцы адбываюцца грубыя парушэнні, і асоба дэградуе. Прычым залежнасць ад спайсаў развіваецца імкліва: у кагосьці за тры-чатыры эпізоды спажывання, а камусьці для незваротных наступстваў хапае і аднай сустрэчы са спайсамі. Ніхто не ведае, што прадаецца пад назвай «спайс», нават яго прадаўцы. У маёй практыцы былі хранічныя гераінавыя наркаманы, якія паспыталі спайс і казалі, што «не дай Бог мне яшчэ раз з гэтай дрэнню сутыкнуцца». Кантраляваць спажыванне спайсу вы не зможаце, гэта ілюзія. У вас будзе пагаршацца памяць, уважлівасць, знізіцца інтэлект, вы дакладна можаце забыцца пра вучобу, бо сканцэнтравацца на чымсьці будзе проста немагчыма. Усё прыемнае, што было ў важным жыцці, таксама знікне...

У маім аддзяленні лячыліся як маладыя людзі, якія яшчэ нічога не паспелі пабачыць у сваім жыцці, так і людзі, якія ўжо мелі свой бізнес, сям'ю, але ўсяго пазбавіліся праз сваю залежнасць. Які шлях выбераце вы — думайце самі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# Цепласеткі рыхтуюць да наступнай зімы

**У мэтах падрыхтоўкі цеплавых сетак сталіцы да работы ў зімовых умовах 2015-2016 года філіял «Мінскія цеплавыя сеткі» РУП «Мінскэнерга» 25 сакавіка будзе праводзіць выпрабаванне цеплавых сетак на разліковую тэмпературу цепланосьбіта, паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама.**

Падчас правядзення выпрабаванняў магчыма павышэнне тэмпературы ацяпляльных прыбораў і паветра ў памяшканнях, а таксама тэмпературы гарачай вады (у выпадку няспраўнасці сістэмы аўтаматычнага рэгулявання). Выпрабаванні праводзяцца з мэтай выяўлення дэфектных і ненадзейных участкаў трубаправодаў цеплавых сетак. Пры выяўленні на тэрыторыях жылога сектара і прылеглых да іх прыкмет парушэння ў працы цеплавых сетак (уцечка цепланосьбіта, пара, утварэнне прамывін) грамадзян просяць праяўляць пільнасць і асцярожнасць. Пра такія факты трэба тэрмінова інфармаваць дыспетчара філіяла «Мінскія цеплавыя сеткі» (тэл.: 298 27 27, 298 27 37) ці бліжэйшы ЖЭС, ЖРЭА. Азнаёміцца з пералікам вуліц, якія трапляюць у зону правядзення выпрабаванняў, можна на сайце Мінгарвыканкама.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Здарэнні

# НАРАДЗІЎСЯ Ў КАШУЛІ

**Можна казаць, што 50-гадовы жыхар вёскі Рыкі Мсціслаўскага раёна, у доме якога ўспыхнуў пажар, атрымаў яшчэ адзін шанц на жыццё. Калі прыехалі выратавальнікі, гарэлі веранда і дах. Знайсці кагосьці жывым у поўнай дыму хаце нават і не спадзяваліся. Тым больш інфармацыі, што там ёсць людзі, наогул не было.**

Пасля некалькіх хвілін безвыніковых пошукаў ліхтарык нарэшце выхапіў з цемры постаць чалавека, які ляжаў на падлозе. Калі мужчыну выцягнулі на паветра, высветлілася, што ён п'яны, але жывы.

Каб уявіць, наколькі мала было ў яго шанцаў выжыць, дастаткова сказаць, што дзве кошкі, якія таксама знаходзіліся ў доме, загінулі.

Як кажуць ратавальнікі, мужчына атруціўся гарэлкай так, што дым на яго ўжо не падзейнічаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# Начная эвакуацыя з-за недакурка?

**Уначы ў сталіцы з-за пажару ў смеццеправодзе работнікам МНС давялося праводзіць эвакуацыю 18 чалавек.**

Пра задымленне у адным з пад'ездаў дзевяціпавярховага дома па завулку Баграціёна паведамілі самі жыльцы. На гадзінніку было 1.13. На месцы выратавальнікі высветлілі, што адбылося загаранне смецця ў шахце смеццеправода і ў прасторы паміж ім і сцяной, а таксама загаранне сілавой устаноўкі ў падвале. З-за моцнага задымлення давялося эвакуяваць 18 чалавек. Ніхто не пацярпеў. Пажар быў ліквідаваны ў 1.45. Часова без электразабеспячэння заставалася 140 кватэр (420 жыльцоў). Прычына здарэння высвятляецца. Адна з версій — неасцярожнае абыходжанне з агнём невядомай асобы.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Добрая навіна

# Пекін стане бліжэй

**З 1 мая авіякампанія AIR CHINA плануе пачаць выкананне рэгулярных палётаў па маршруце Пекін — Мінск — Будапешт — Пекін.**

Перамовы наконт адкрыцця новага маршруту прайшлі нядаўна ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Абмяркоўваліся пытанні, якія датычаць, у тым ліку, тэхналогіі абслугоўвання паветраных суднаў, пасажыраў, грузаў авіякампаніі, прадастаўленне паслуг па забеспячэнні бартавым харчаваннем. Паводле інфармацыі прэс-цэнтра Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», рэйсы будуць выконвацца на самалётах Airbus A330-200 чатыры разы на тыдзень (панядзелак, серада, пятніца, нядзеля).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

**Вытанчаныя, арыстакратычныя ўладанні Радзівілаў у Нясвіжы цяпер усе ведаюць як палацава-паркавы комплекс. Аднак палац адначасова з'яўляецца і замкам, які вытрымліваў аблогі падчас розных войнаў. Больш таго, у ім выраблі калекцыю гармат з унікальным аздабленнем. Усе захопнікі імкнуліся вывезці іх як самы жаданы трафей. Аднак гарматы, быццам шчаслівым лёсам адзначаныя, зноў вярталіся туды, дзе былі адлітыя...**




# ПРЫГОДЫ НЯСВІЖСКІХ ГАРМАТ

## З-за сваёй прыгажосці яны былі пажаданым трафеем для захопнікаў

***Падрабязней пра гэта можна пачытаць у кнізе Міколы Волкава «Артылерыя Нясвіжскага замка», якая выйшла ў выдавецтве Андрэя Янушкевіча. Аўтар з'яўляецца прафесійным гісторыкам, аднак гэтую працу напісаў так, каб чытаць было цікава ўсім, разбавіў яе аповедамі пра рэальных людзей... Але пакуль кніжка яшчэ не трапіла ў вашы рукі, прапаную, са слоў Міколы Волкава, пераказаць частку тых прыгод, што выпалі на долю нясвіжскіх гармат:***

### УНІКАЛЬНАСЦЬ ЕЎРАПЕЙСКАГА МАШТАБУ

«Я апрацаваў шмат інвентароў, апісанняў узбраенняў фартэцый Радзівілаў, Сапегаў, некаторых іншых родаў. З цягам часу стала відавочна, што артылерыя нясвіжскага замка — з'ява выключная ў гісторыі не толькі Беларусі, але і ўсяго Вялікага Княства Літоўскага і нават Рэчы Паспалітай. У Расіі ўвогуле быў іншы дзяржаўны лад, і прыватныя асобы такую артылерыю ніколі не заказалі б.

Чым унікальныя гэтыя гарматы? Па-першае, яны маюць вельмі адметны дэкор. Унікальнасць такога аздаблення трэба разумець у еўрапейскім маштабе. У 1886 годзе Нясвіж наведваў крон-прынц Фрыдрых Вільгельм (у будучыні ён стаў Вільгельмам ІІ, пры ім Германія распачала Першую сусветную вайну). У сваім дзённіку ён апісвае нясвіжскія гарматы і адзначае: «Такой калекцыі выдатнай зброі я не бачыў нідзе ў іншым еўрапейскім музеі».

Працуючы з літаратурай па збройнай справе, я не бачыў настолькі дасканалага дэкору гармат больш ні ў якой краіне — гэта ўнікальная з'ява.

Па-другое, арсенал унікальны тым, што захоўваўся ў Нясвіжы, з невялікімі перапынкамі, цягам трох з паловай стагоддзяў: ад канца XVI стагоддзя да 1940 года. У іншых беларускіх фартэцыях, такіх як Ляхавічы, Слуцк (у пэтэнцыяле яны былі нават мацнейшыя за Нясвіж) таксама была артылерыя, але яе знішчылі ў XVIII стагоддзі.

Па-трэцяе, гарматы мелі вялікае значэнне для Радзівілаў на працягу чатырох стагоддзяў — з сярэдзіны XVI па пачатак XX стагоддзя. Яны сведчылі пра каралеўскія амбіцыі гэтага роду.

### ДЭКОР З САЛАМАНДРАЙ

Знешні выгляд надзвычай арыгінальны. На ствале мы можам бачыць сяміглаовую гідру — напэўна, магічным спосабам яна павінна была дапамагаць гарматам страляць. Часам іх аздаблялі ўзоры ў выглядзе вінаградных гронак. Некаторыя з іх нагадваюць патрушчаную калону. Яна быццам абвязана вяроўкамі для нядання трываласці — але і вяроўкі насамрэч выліты з бронзы. Такая знешняя «старажытнасць» з'яўляецца мастацкай стылізацыяй.

Паўстае пытанне, навошта Мікалаю Крыштафу Радзівілу Сіротку, які пабудаваў гэты замак, заснаваў арсенал, трэба было так упрыгожваць гарматы? Я пакуль што не знайшоў адказу на такое пытанне. Можа, камусьці з вас удасца гэта зрабіць...

Але гэты дэкор «працаваў»: ён не толькі дэманстраваў высокі статус уласніка і яго амбіцыі. Напрыклад, пры Сіротку была адліта серыя гармат, якая называлася «4 элементы» — вада, зямля, агонь і паветра. А ў замку было чатыры бастыёны — усё сімвалічна.

У архіве Радзівілаў у Польшчы захоўваецца выява невядомай гарматы. На ёй няма ніякіх подпісаў, але на пярэдняй частцы ствала мы яўна бачым саламандру. Языкі полымя ззаду і рыбіна луска спераду акурат сведчаць пра гэту істоту. Перагледзеўшы ўсе інвентары радзівілаўскіх, сапегаўскіх рэзідэнцый, я дакладна магу сказаць, што гармата «Саламандра» была толькі адна — у Нясвіжы.

Яна была зроблена на ўзор тых, што адліваў імператар Максіміліян І. Парай да нясвіжскай «Саламандры» была гармата «Кракадзіл», якая захоўвалася ў калекцыі імператара. Гэта значыць, што Сіротка спецыяльна заказваў зброю на ўзор той, што была ў кіраўніка Свяшчэннай Рымскай імперыі, спецыяльна яе архаізаваў і надаваў такую складаную форму. З гэтага мы можам рабіць выснову пра палітычную лінію, якой прытрымліваўся Сіротка.

Вывучаючы гэтыя гарматы, можна дакрануцца да ўнутранага свету, менталітэту людзей, што іх стварылі.

У гісторыі нясвіжскай зброі шмат як белых, так і чорных, шэрых плям. Усё гэта вельмі інтрыгуе і падштурхоўвае даследаваць далей.

### «ПАТОПЛЕНЫЯ» ГАРМАТЫ АДКАПАЛІ СЯЛЯНЕ З ЛАХВЫ

З-за сваёй прыгажосці гарматы сталі пажаданым трафеем для захопнікаў. Адна з першых гармат, якая трапіла ў рукі ворагаў, у 1625 годзе была знойдзена ў Біржайскім замку, адтуль вывезена ў Стакгольм. Яна захавалася да нашага часу і цяпер стаіць у музеі арміі ў Стакгольме.



Гармата, стылізаваная пад патрушчаную калону.

У час 13-гадовай вайны ў 1654—1667 гадах замак быў акружаны. Захавалася згадка з тых часоў, напісаная слуцкім намеснікам Багуслава Радзівіла: «Шкада будзе, калі возьмуць Нясвіжскі замак, там такая прыгожая артылерыя захоўваецца!» На шчасце, Нясвіжскі замак выстаяў і зброя захавалася на месцы.

У час Паўночнай вайны са шведамі замак усё ж узялі. У 1706 годзе пад яго сцены падышоў Карл XII, які меў славу непераможнага, і яму вырашылі не супраціўляцца. Кароль меў магчымасць агледзець гарматы і вырашыў вывезці ў Стакгольм. Але перавозіць іх сталі незвычайным чынам. У Карла былі планы ва Украіне, і гарматы таксама накіравалі туды. Цягнуць іх даявлося праз Прыпяць, аднак высветлілася, што тыя, хто іх перавозіў, не разлічылі свае сілы. Гарматы вырашылі затапіць, гэта адбылося ў 1706 годзе. Самае цікавае, што ніхто не ведаў, куды падзелася зброя. Радзівілаўскія падначаленыя рапартавалі, што ўсе гарматы забралі з сабой шведы ці пераправілі. Аднак у 1717 годзе нечакана сяляне з вёскі Лахвы (цяпер Лунінецкі раён) у рэчцы адкапалі гэтыя гарматы і вярнулі іх у Нясвіж.

### ЦІ ЎСЕ СКАРБЫ ЗНАЙШЛІ?..

Інтрыгуючыя падзеі адбываліся і ў другой палове XVIII стагоддзя, калі замак належаў Пане Каханку. Ён меў каралеўскія амбіцыі, яго рыхтавалі да таго, каб стаць каралём. Ён і сам усяляк імкнуўся да такога стану, таму пастаянна ўвязваўся ў канфлікты з пратэктарам тагачаснага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага — Расіяй. Пры Пане Каханку расійскія войскі двойчы займалі замак: у 1771 годзе яны абсалютна «абчысцілі» збройню. Усе гарматы былі расплаўлены і прададзены ў Каралявец (сучасны Калінінград) — так сведчаць крыніцы. Але, што цікава, вярнуўся Пане Каханку і з ім зноў вярнуліся гарматы! Узнікае пытанне, дзе ён іх хаваў?..

У 1792 годзе каля 40 гармат зноў былі дзесьці схаваныя. У 1812 годзе, пасля адступлення Дамініка Радзівіла, з замка вывозіліся ўсе каштоўнасці. Хутчэй за ўсё, самыя прыгожыя гарматы і на гэты раз схавалі. Перыяд канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя быў даволі «цёмным», з пункту гледжання таго, што хавалі, дзе і ці змаглі пасля знайсці... Бо пасля таго, як падзеі вайны з Напалеонам прайшлі, у 1819 годзе 30 гармат знайшліся ў адным з памяшканняў замка — пра іх ніхто не ведаў. Гэта падштурхоўвае нас да разваг, што, можа, не ўсе гарматы, якія калісьці хавалі ў Нясвіжы, былі знойдзены, як і не ўсе скарбы?.. Многія ведаюць пра 12 залатых апосталаў, якія дзесьці ляжаць і чакаюць тых, хто іх адшукае — але звестак пра іх вельмі мала. А вось гарматы згадваюцца ў многіх крыніцах. Мы можам меркаваць, што іх хавалі, прычым вельмі добра.

Пасля таго, як расійскія войскі вывезлі гарматы, яны даведаліся, што Пане Каханку яшчэ штосьці ўтаіў. Знайшлі нават чалавека (артылерыста Радзівілаў), які ведаў, дзе яны схаваны. Прывезлі яго ў Нясвіж, капалі ў трох месцах глыбокія ямы, але безвынікова.

### «ІХ ПАКРУЧАСТЫ ЛЁС ПРАЦЯГВАЕЦЦА»

Пакручасты лёс гармат працягваўся. У пачатку XIX стагоддзя Радзівілы выбралі каля 20 самых прыгожых з іх і пакінулі для сваёй прыватнай калекцыі як каштоўны рэлікт. Яны захаваліся да нашага часу.

З пачаткам Першай сусветнай вайны, калі па тэрыторыі Беларусі прайшла лінія фронту, расійскае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб вывазе ўсіх каштоўных для абароннай прамысловасці матэрыялаў (званоў, старых гармат) углыб Расіі. Пасля таго большасць званоў у нашы цэрквы і касцёлы так і не былі вернутыя. Але нясвіжскія гарматы захавалі і не пусцілі на пераплаўку.

У пачатку 1920-х гадоў па дамоўленасці савецкай Расіі з Польшчай іх перадалі ў Варшаву. Прычым адпраўлялі 21 гармату, а прыбыло ў Польшчу 24 — значыць, па дарозе дзесьці знайшлі яшчэ 3. Паляжаўшы крыху ў каралеўскім замку ў Варшаве, яны былі вернуты ў Нясвіж. Але там, на жаль, доўга не затрымаліся. У 1940 годзе, калі ў замка былі ўжо новыя ўласнікі, каштоўную зброю перадалі ў Мінск. Ёсць фотаздымак 1942 года, дзе гарматы ляжаць у дворыку гістарычнага музея, а на іх вісіць шыльдачка: «З гэтых гармат літоўскія феадалы стралялі па беларускіх сялянах». Такі спосаб інтэрпрэтацыі нашай спадчыны цяпер здаецца камічным.

У 1942—1943 гадах іх вывезлі ў Берлін як сведчанне заваёў нямецкага войска. У дакуменце, які пацвярджае гэта, напісана, што разам была перададзена і скрынка з гістарычнымі малюнкамі... Адразу ўзнікаюць пытанні, што гэта былі за малюнкі, куды яны падзеліся? Адтуль зброя пазней была вывезена ў Санкт-Пецярбург. Мноства рабіліся запыты адносна скрынкі, але пра яе нічога не вядома... Такім чынам, нас яшчэ чакаюць адкрыцці. Трэба шукаць, і мы знойдзем шмат цікавага ў гісторыі.

У 1953 годзе па дамоўленасці з палякамі гарматы былі перададзены ў Варшаву. Сёння большасць з іх захоўваецца ў музеі Войска Польскага. Для нясвіжскага замка зроблены дзве копіі гэтых гармат...»

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

---

Байкі кухмістра Верашчакі

# ПРЭЦЭДЭНТ ЯНА ШЫТЛЕРА

**Славутыя аўтаркі нашых першых кулінарных энцыклапедый, Ганна Цюндзявіцкая і Вінцэнта Завадская, бадай, не здолелі б напісаць свае славутыя кнігі, калі б не мелі папярэдніка, чыё імя сёння трохі адышло ў цень.**

Ян (дакладней, Ёган) Шытлер нарадзіўся ў Варшаве ў 1763 годзе ў сям'і кухара-немца. Яшчэ ў 14-гадовым узросце пачаў працаваць кухцікам пры двары Агінскіх у Седльцах — у Міхала Казіміра Агінскага і яго жонкі Аляксандры. Так што яму давядзілася непасрэдна карміць магната, а па сумяшчальніцтве — кампазітара, паэта і мецэната. Пазней, ужо з рэпутацыяй дасведчанага кухара, ён пачаў працаваць пры двары караля Станіслава-Аўгуста, пад кіраўніцтвам славутага кухмістра Трэмо. Пасля адрачэння караля і падзення Рэчы Паспалітай (1795) працаваў пры розных прыватных кухнях. Пачатак XIX стагоддзя заспеў яго на Падоллі ў Старжынскіх. Там яго «перакупіў» Карл Дамінік Пшаздзецкі і неўзабаве перавёз у свой новы маёнтак Смаргонь, куплены ў 1805 годзе ў таго ж роду Агінскіх. Рэшта жыцця Шытлера будзе трывала звязана з Літвой.

Набліжаючыся да ўзросту, які б сёння назвалі пенсійным, пабадзяўшыся па самых розных чужых дварах, Шытлер, натуральна, адчуваў вялікую стомленасць. Але ён ужо задумаў своеасаблівыя «ўцёкі»: а што, калі пачаць пісаць і выдаваць уласныя кулінарныя кнігі? Можа быць, у старасці з гэтага ўдасца пракарміцца?

Першая кніга Шытлера «Кухня мысліўская ці на ловах» выйшла ў Вільні ў 1823 годзе і атрымала надзвычайны, як на тыя часы, поспех. За ёй былі выдадзены «Кухар добра навучаны» (1830, пазней некалькі разоў перавыдаваўся), «Парадник для паляўнічых» (1839), «Спіжарня дастаткова і абачліва абсталяваная» (1841), «Ашчадная гаспадыня» (1846) і іншыя (усе — Вільня).

Кнігі Шытлера былі сенсацыйнымі не толькі для Літвы пад расійскім уладаннем, дзе дагэтуль не выдаваліся ніякіх кухарскіх кніг, але і для ўсяго польскамоўнага свету, бо гэта былі першыя сістэматычныя, фактычна амаль сучасныя кнігі гэтага жанру. Польскія кулінарныя кнігі, якія выдаваліся дагэтуль, пісаліся быццам бы на адных зашыфраваных намёках: славутыя кухмістры, калі і браліся за гэтую справу, раўніва берaглі свае сакрэты, таму зразумець іх рэцэпты і нешта прыгатаваць паводле іх магла толькі жменька дапушчаных да таямніцы знаўцаў. Вось, напрыклад, як выглядаў адзін з рэцэптаў таго ж Чарнецкага: «Вазьмі каплуна, або цяляціны, або ялавічыны, або аляніны, або казулю, або лань, або зайца, пасячы, вымачы, асушы, упрыгож. Цыбулю пакрышы колцамі, пятрушку ўздоўж, яблык пашаткуй, масла добрага, солі, лімона, алівак, перцу, віннага воцату, слодычу, разынак абодвух відаў, цынамону, мускатнага арэху. Звары і дай на стол». Ці шмат такі рэцэпт дапаможа ў прыгатаванні?

А Шытлер збіраўся далей жыць не з гатавання, а з продажу кухарскіх кніг. Таму рэцэпты ён рабіў максімальна дакладнымі, набліжанымі да сучасных. З якой часткі тушы трэба ўзяць мяса, якой вагі, колькі дакладна і якіх спецый узяць, як доўга і пры якім тэмпературным рэжыме гатаваць... Але ў аўтара былі ўласныя страхі: кантрафактныя выданні! Шытлер раўніва абараняў аўтарскае права, уласнаручна падпісваючы кожны асобнік.

Шытлер працягнуў лінію Трэмо — адмаўлення ад сармацкіх кісласалодкіх, занадта вострых і тлустых страў, набліжаючыся да сучасных патрабаванняў дыеталогіі. Ён гатуе мяса не ў шафране, а ў белым віне, што ў XVIII стагоддзі нікому не прыйшло б у галаву. Ён уводзіць у меню шмат розных супоў, што таксама было б дзівацтвам у эпоху Рэчы Паспалітай. Яго кнігі складаюцца пераважна з нямецкіх і французскіх рэцэптаў, але раз-пораз трапляюцца і мясцовыя, літоўскія: у прыватнасці, менавіта ён упершыню правадзіць рэцэпт халадніку (які адначасова ў Парыжы апявае Адам Міцкевіч як паэт).

Поспех Шытлера пераўзышоў самыя смелыя чаканні, аўтар сапраўды здолеў зарабіць на кнігах добрыя грошы і забяспечыць сабе бязбедную старасць. Бо так, як ён, не ўмелі тады пісаць ані ў Варшаве, ані ў Маскве або Пецярбургу. Праўда, стаўленне літоўскай эліты да яго было дваістым: з аднаго боку, ён упершыню раскрыў шырокай публіцы кухарскія сакрэты і даў магчымасць звычайным гаспадыням гатаваць па ўзорах дарагіх кухмістраў, якіх яны ніколі не здолелі б наняць. З другога боку, падкрэслены апалітызм яго кніг рэзка кантраставаў з надзеямі і расчараваннямі палітычна ангажаванай публікі, з пакутамі ахвяр рэпрэсій. Бо ўжо выхад самай першай кнігі Шытлера супаў з раскрыццём палітычнай арганізацыі філаматаў і філарэтаў і рэпрэсіямі, якія надышлі за гэтым.

Яго кнігі аказалі моцны ўплыў на нашых кулінарных аўтарак наступнага пакалення, асабліва на Вінцэнту Завадскую, якая шмат пазычыла ў Шытлера для «Літоўскай кухаркі» (а ў яе, у сваю чаргу — Алена Малахавец, аўтарка першай рускай кухарскай кнігі).

Як ацэньваць гэтага некалі славутага чалавека — як апалітычнага і бяздушнага эгаіста або як разважлівага і дасведчанага прафесіянала? Няхай кожны вырашае сам. Я прызнаюся, што мяне трохі цвеліць спакуса аб'явіць Шытлера вынаходнікам славутых смаргонскіх абаранкаў. Ну хіба дарма ён пражыў тыя некалькі гадоў у Смаргоні? Але стрымаюся пакуль, трэба спачатку больш уважліва вывучыць ягоную спадчыну і гісторыка-кулінарны кантэкст таго часу.

■ Нерухомасць

# ГАСПАДАРЫ ОФІСАЎ ПАМЕНШЫЛІ АПЕТЫТЫ

## У сталіцы істотна патаннела арэнда памяшканняў для «белых каўнерыкаў»

**Эксперты сталічнага рынку камерцыйнай нерухомасці падлічылі, што сярэдні кошт арэнды памяшканняў у бізнес-цэнтрах Мінска знізіўся з пачатку года на 12%. Аб гэтым паведамляе кіраўнік праектаў агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Наталля НОВІКАВА.**



**Асобныя офісы могуць і пуставаць.**

### ТЭНДЭНЦЫЯ — НА ЗНІЖКІ

Такім чынам, толькі за люты арэндныя стаўкі ў мінскіх офісах класа «А» (вышэйшы ўзровень) знізіліся на 5% — да 27,2 еўра за квадратны метр з ПДВ. Больш за ўсё за месяц «схуднелі» стаўкі ў аб'ектах С-класа — на 15%. Цяпер «квадрат» у іх у сярэднім абыходзіцца арандатарам ў 13,6 еўра. Стаўкі арэнды ў бізнес-цэнтрах класа «В» знізіліся на 8% і ў сярэднім складаюць 18 еўра за адзінку плошчы.

Між іншым, сёння попыт на рынку арэнды офісных плошчаў застаецца стабільным. Аднак арандатары сталі больш пераборлівымі пры выбары памяшканняў, а ўласнікі бізнес-цэнтраў у большасці сваёй ідуць на ўступкі. У выніку знізіліся стаўкі і ўзрасла колькасць прэферэнцый з боку дэвелапераў. У той жа час рынак цяпер актыўна карэктуе цэнаўтварэнне, пры гэтым з выхадам на раўнаважны стан арэндныя стаўкі могуць зафіксавацца на адным узроўні. Але для дасягнення балансу попыту і прапановы на рынку павінен прайсці яшчэ некаторы час, лічыць спецыяліст.

### ПРАПАНОВА «ПЕРАСКОКВАЕ» ПОПЫТ

Тут трэба ўлічваць і той факт, што цяпер у Мінску будуецца больш за 30 офісных аб'ектаў. А ў выніку на працягу года рынак офісная нерухомасці можа прырасці яшчэ на 170 тысяч «квадратаў». Сярод знакавых бізнес-цэнтраў — Riviera Plaza са SPA-комплексам і Premier Palace з гандлёвай зонай (абодва — на праспекце Пераможцаў), «Красавік» з суперофісам (на праспекце Жукава) і «Магістр» (Уручча). «Прафесіяналізм дэвелаперскага бізнесу расце, а мінскі рынак офіснай нерухомасці выходзіць на еўрапейскі ўзровень. Аднак попыт не паспявае за прапановай», — патлумачыла сітуацыю эксперт.

Рэкордныя аб'ёмы ўводу офісных плошчаў разам з няпэўнай макраэканамічнай сітуацыяй аказваюць ціск на ўзровень арэндных ставак. Разумеюць гэта як арандатары, так і ўласнікі. Прычым калі раней больш выгадныя ўмовы арэнды прапаноўвалі новыя бізнес-цэнтры, якім важна як мага хутчэй знізіць узровень вакантнасці, то цяпер падобныя ўмовы прадастаўляюць і дзейныя аб'екты.

### НАБЫЦЦЁ ВА ЎЛАСНАСЦЬ — НЕ Ў ФАВОРЫ

Пры гэтым рынак пераарыентуецца з продажу офісных плошчаў на іх арэнду. «Цяпер офісныя памяшканні рэалізуюцца толькі на пляцоўках унікальных аб'ектаў або па прывабных цэнах. Простыя памяшканні, ды яшчэ па завышаным кошце, як правіла, застаюцца незапатрабаванымі», — патлумачыла агульную сітуацыю кіраўнік праектаў. На другасным рынку офіснай нерухомасці цэны знізіліся з лютым на 14%. За квадратны метр у бізнес-цэнтрах В-класа цяпер у сярэднім просяць 2090 умоўных адзінак (USD), С-класа — 1860 у. а. Пры гэтым прымальныя для рынку цэны ў сярэднім ніжэй на 15-20%.

### КЛІЕНТАЎ «ПРАГЛЫНУЦЬ» ГІБРЫДНЫЯ КОМПЛЕКСЫ?

У найбліжэйшай будучыні ўскладніцца структура рынку офіснай нерухомасці, лічыць эксперт. Сёння ў Мінску ўзводзяцца комплексы, якія спалучаюць у сабе офісныя, гандлёвыя і забаўляльныя аб'екты. Калі ў Маскве, Варшаве або Парыжы гэта ўжо стала нормай, то для Мінска — рэдкасць. У цені такіх гігантаў пасрэдным аб'ектам стане складаней заняць сваю нішу на рынку, упэўнена прадстаўніца агенцтва нерухомасці.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Новы інвестыцыйны калідор

**Беларускія свабодныя эканамічныя зоны могуць стаць пасярэднікамі ў супрацоўніцтве паміж Еўропай і Расіяй. Такую думку выказаў прэзідэнт Сусветнай федэрацыі свабодных і спецыяльных эканамічных зон Хуан Торэнтс.**

У Гомелі на кангрэс свабодных эканамічных зон Паўночнай і Усходняй Еўропы «Глабалізацыя бізнесу і прамыя замежныя інвестыцыі. Новы інвестыцыйны калідор» сабраліся прадстаўнікі 23 краін свету. Сярод 200 дэлегатаў — эксперты, эканамісты, кіраўнікі дзяржаўных органаў улады. Па словах Хуана Торэнтса, кангрэс павінен пакласці пачатак стварэнню ўсходняга калідора для руху інвестыцый:

— З пункту гледжання лагістыкі Беларусь выбрана невыпадкова. Ваша краіна мае стратэгічна важнае размяшчэнне, знаходзіцца на скрыжаванні шляхоў паміж ЕС і Расіяй. Ёсць магчымасць з усімі сустрэцца і выслухаць думкі ўсіх па пытаннях супрацоўніцтва.

Сёння ў структуру свабоднай эканамічнай зоны «Гомель-Ратон» уваходзіць 76 прадпрыемстваў-рэзідэнтаў, якія паспяхова супрацоўнічаюць з 70 краінамі свету, нагадаў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік:

